# ТАТА ЦІ НЕ?

## Як у віцебскай лабараторыі пацвярджаюць бацькоўства

СПАЧАТКУ некалькі непрыдуманых прыкладаў.

Мужчына і яго таварыш, жонка першага і сын прыйшлі на даследаванне. Сябар сям'і пажадаў, каб пацвердзілі яго бацькоўства, бо каханка сказала, што нарадзіла ад яго. Высветлілася, што ні ён, ні законны муж не з'яўляюцца татам дзіцяці.

**Віцебск стаў трэцім абласным цэнтрам пасля Брэста і Гродна, дзе пачалі праводзіць ананімнае даследаванне сваяцтва.**

Бывае, што і мамы хочуць упэўніцца, што дзіця іх роднае. Мо падмянілі ў радзільным доме? У прыватнасці, быў выпадак, калі ў здаровых мужа і жонкі нарадзілася цяжка хворае дзіця. Высветлілася, што гэта менавіта іх сын.

Мужчына, каб забраць дзіця з інтэрната пасля смерці яго мамы, добраахвотна пажадаў вызначыць бацькоўства.

НЕКАЛЬКІ разоў да эксперта ў звярталіся замежныя грамадзяне. Першы быў... японец. Хлопчык, як дзве кроплі вады падобны на яго. Мама дзіцяці — беларуска. Але не было дакументаў, якія пацвердзілі б бацькоўства для пераезду сям'і ў Японію. Малы, дзякуючы экспертам, «атрымаў тату».

— З 2014 года праводзяцца экспертызы спрэчнага сваяцтва. І ў любым выпадку патрабавалася прысутнасць усіх зацікаўленых асоб. Размова пра маму, дзіця, мяркуемага бацьку. Сёлета ўжо выканана 100 экспертыз. У 82 выпадках сваяцтва пацвердзілася. А цяпер ёсць магчымасць і ананімнага даследавання, — расказвае **начальнік аддзела судова-біялагічных і судова-генетычных экспертыз упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці Настасся ЗАБАБУХА.**

Праўда, у якасці доказу ў судзе вынік ананімнага даследавання выкарыстоўваць нельга. Але розныя бываюць выпадкі. Напрыклад, муж не верыць у бацькоўства, а сапсаваць стасункі з жонкай не хоча. Або бабуля, напрыклад, не можа заснуць спакойна і просіць сына, каб праверыў...

ДАРЭЧЫ, экспертызы ў дачыненні да больш дальніх сваякоў, тых жа бабуль, праводзяцца толькі ў цэнтральным апараце Дзяржаўнага камітэта ў Мінску.

— Таму што ў два разы складаней вызначыць сваяцтва... Наконт кошту паслугі ў нас: для грамадзян Беларусі — 197,33 рубля, для іншаземцаў — 258,31 рубля, — працягвае суразмоўніца.

Кошт даследавання, дарэчы, панізіўся у параўнанні з 2014 годам. Тады яно каштавала каля 4,5 мільёна «старымі».

Вынік даследавання можна атрымаць цягам 30 дзён.





— Каб выключыць магчымасць недакладнага выніку даследавання, неабходна старанна падысці да працэдуры, — тлумачыць эксперт.

Спатрэбіцца новая ўпакоўка ватных палачак, два чыстыя канверты, кавалак паралону, пара пальчатак і нажніцы. У пальчатках трэба ўзяць 2—3 гігіенічныя палачкі, адзін з канцоў якіх трэба абрэзаць. Ватным тампонам на другім канцы з некаторым высілкам зрабіць саскрэб клетак з унутранай паверхні шчакі. Потым узоры трэба высушыць, змясціўшы іх у паралон ватнымі тампонамі ўверх. І гэта трэба зрабіць ва ўмовах, якія выключаюць уздзеянне сонечных прамянёў, вільгаці, ацяплялыных прыбораў...

Калі ўсё зрабіць правільна, верагоднасць памылкі — 0,0001%.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Сямейная кансультацыя

# ДВАЙНОЕ ІМЯ, ШЛЮБ ЗА МЯЖОЙ І РАЗВОД ПА ЗГОДЗЕ



На пытанні адказвае Жанна ЗАХАРАВА, начальнік упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі:

***— Маці звярнулася ў загс, каб зарэгістраваць маё дзіця. Узнікла пытанне, ці можна даць немаўляці двайное імя? Якое з імён будзе афіцыйным? Якое будзе пазначана ў пасведчанні аб нараджэнні?***

***Аліна Г., г. Баранавічы***

— Так, пры рэгістрацыі нараджэння дзіцяці яму можна прысвоіць двайное імя. У адпаведнасці з артыкулам 69 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і (Кодэкса) дзіцяці можа быць дадзена не больш за два ўласных імені. Імя, занатаванае ў запісе акта аб нараджэнні першым, лічыцца асноўным.

Орган загс не мае права адмовіць у прысваенні малому выбранага бацькамі ўласнага імя, калі толькі яно не супярэчыць нормам грамадскай маралі і нацыянальным традыцыям. Паколькі ў пасведчанні аб нараджэнні падаюцца звесткі, якія ўтрымліваюцца ў запісе акта аб нараджэнні, у графе «уласнае імя» пасведчання будуць запісаны абодва ўласныя імені дзіцяці.

***— Я і мой жаніх — грамадзяне Беларусі, аднак цяпер пражываем у Германіі. Калі мы заключым шлюб у Германіі, ці будзе ён прызнаны ў Беларусі? У далейшым не выключаем пражыванне на радзіме.***

***Святлана Пятроўна, г. Нясвіж***

— Так, шлюб, зарэгістраваны па-за межамі Беларусі з захаваннем формы шлюбу, устаноўленай законам месца яго здзяйснення, будзе прызнаны на тэрыторыі нашай краіны пры ўмове, што ён не супярэчыць патрабаванням артыкулаў 17—19 Кодэкса. Гэты датычыцца шлюбаў за межамі паміж беларусамі, шлюбаў грамадзян Беларусі з замежнымі грамадзянамі або асобамі без грамадзянства.

Хачу перасцерагчы, што калі ў будучыні вы плануеце пражыванне ў Беларусі, то можаце сутыкнуцца з пэўнымі цяжкасцямі, звязанымі з ажыццяўленнем (пры неабходнасці) такіх адміністрацыйных працэдур, як выдача паўторнага пасведчання аб заключэнні шлюбу, унясенне змяненняў, выпраўленняў дапаўненняў у запіс акта, выдача на падставе запісу акта даведак і іншых дакументаў.

Вам варта звярнуць увагу, што артыкулам 238 Кодэкса для грамадзян Беларусі і для беларусаў, якія пражываюць за мяжой, прадугледжана магчымасць звяртацца па рэгістрацыю актаў грамадзянскага стану ў дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Беларусі. Пры рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану ў гэтых арганізацыях прымяняецца беларускае заканадаўства. Дадам, што першыя экзэмпляры запісаў актаў, здзейсненыя ў дачыненні да грамадзян Беларусі, якія пражываюць на тэрыторыі замежнай дзяржавы, захоўваюцца ў дыпламатычных прадстаўніцтвах, а другія — у архіве органаў, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану Мінскага гарвыканкама. Такім чынам, рэгістрацыя актаў грамадзянскага стану ў гэтых установах дазволіць пазбегнуць у далейшым абазначаных вышэй праблемных сітуацый.

***— Мы з мужам вырашылі скасаваць шлюб і звярнуліся ў суд з іскавай заявай, а нас накіравалі ў загс. У які загс нам неабходна звярнуцца і што для гэтага трэба?***

***Марына С., Мінскі раён, г. Барысаў***

— У адпаведнасці з Кодэксам скасаванне шлюбу ў загсе праводзіцца па ўзаемнай згодзе мужа і жонкі, якія не маюць агульных непаўналетніх дзяцей і спрэчак аб маёмасці.

Калі вы абое згодныя на скасаванне, не маеце непаўналетніх дзяцей і маёмасных прэтэнзій, вы можаце падаць заяву аб рэгістрацыі скасавання шлюбу, а таксама дакументы, прадугледжаныя заканадаўствам аб адміністрацыйных працэдурах, у загс па месцы жыхарства (месцы знаходжання).

Праз месяц з дня падачы сумеснай заявы праводзіцца рэгістрацыя скасавання шлюбу ў прысутнасці мужа і жонкі.

Шлюб, скасаваны ў органах загса, лічыцца спыненым з дня рэгістрацыі яго скасавання, а дакументам, які пацвярджае спыненне шлюбу, з'яўляецца пасведчанне аб скасаванні шлюбу.

***— Больш за пяць гадоў пражываю разам з бацькам майго дзіцяці, аднак афіцыйна мы не браліся шлюбам. У пасведчанні аб нараджэнні ў графе «бацькоўства» тата запісаны з маіх слоў, а я лічуся маці-адзіночкай. Цяпер бацька дзіцяці хоча быць запісаным у пасведчанні аб нараджэнні. Куды нам звярнуцца, каб вырашыць гэтае пытанне?***

***Алеся Н., Полацкі раён***

— Вам сумесна з бацькам дзіцяці неабходна падаць заяву аб рэгістрацыі ўстанаўлення бацькоўства ў загс па месцы вашага жыхарства або месцы жыхарства вашага абранніка ці па месцы рэгістрацыі нараджэння малога.

Артыкулам 51 Кодэкса вызначана, што паходжанне дзіцяці ад бацькі, які не знаходзіцца ў шлюбе з маці малога, устанаўліваецца на падставе сумеснай заявы бацькоў дзіцяці аб рэгістрацыі ўстанаўлення бацькоўства, пададзенай у органы, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану, або рашэння суда аб устанаўленні бацькоўства.

На падставе запісу акта аб устанаўленні бацькоўства орган загс унясе звесткі аб бацьку і неабходныя змяненні ў запіс акта аб нараджэнні дзіцяці і выдасць новае пасведчанне аб нараджэнні

■

***Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. Разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы.***

■ Будзьце пільнымі!

# ПРЫМУСІЎ ПРАДАЦЬ КВАТЭРЫ

**Супрацоўнікі сталічнай міліцыі вышукваюць 19-гадовага расіяніна. Уладзіслаў Кузняцоў падазраецца ў завалоданні ашуканскім шляхам грашовымі сродкамі ў памеры 65 тысяч долараў.**

— Візіту маладога чалавека ў нашу краіну папярэднічала яго знаёмства ў сацыяльнай сетцы з 18-гадовай мінчанкай Ганнай, якая запрасіла хлопца ў госці. Першы час Уладзіслаў пражываў у сваёй сяброўкі, але праз два месяцы маці дзяўчыны папрасіла яго сысці. Разам з ім Ганна пераехала да сваёй сяброўкі Марыі, якая ў далейшым і стала пацярпелай. Утраіх маладыя людзі жылі ў аднапакаёвай кватэры на вуліцы Галадзеда. Праз месяц гаспадыні кватэры сталі прыходзіць у сацыяльнай сетцы паведамленні ад невядомай дзяўчыны, якая пісала, што нібыта з'яўляецца пазашлюбнай дачкой яе бацькі, і патрабавала неадкладна прадаць кватэру і перадаць ёй грошы. Кавалёў, якому было вядома пра сітуацыю, што склалася, прапанаваў сваю дапамогу ў якасці пасрэдніка, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Партызанскага РУУС г. Мінска Наталля ГАНУСЕВІЧ.**

Дзяўчына прадала аднапакаёвую кватэру за 28 тысяч долараў, а грошы аддала Уладзіславу для далейшай перадачы. Затым усе яны пераехалі жыць у кватэру маці Марыі. Кузняцоў у Мінску не працаваў. Ён прапанаваў сваім сяброўкам адкрыць начны клуб. Для таго каб унесці грошы на першапачатковае развіццё бізнесу, прапанаваў прадаць трохпакаёвую кватэру маці Марыі. Жанчыны, пагадзіўшыся на здзелку, прадалі трохпакаёўку за 37 тысяч долараў, а самі зарэгістраваліся і пераехалі жыць у вёску ў Мінскім раёне. У канчатковым выніку Кузняцоў забраў выручаныя за продаж кватэр грошы і з'ехаў у Расійскую Федэрацыю.

З заявай у міліцыю звярнулася маці Марыі, ужо былая гаспадыня трохпакаёвай кватэры. Яна расказала, што стала ахвярай махляра, і папрасіла прыцягнуць яго да адказнасці. Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку ўстанавілі, што Кузняцоў датычны таксама і да продажу аднапакаёвай кватэры. Менавіта ён, зарэгістраваўшыся ў сацыяльнай сетцы пад выглядам дзяўчыны, прадставіўся пазашлюбнай дачкой бацькі Марыі і запатрабаваў прадаць кватэру.

Аператыўнікі маюць падставы меркаваць, што пацярпелых можа быць больш. Кавалёў мог прадстаўляцца прозвішчам Балак. Меркавана можа знаходзіцца на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі або Украіны.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■